привлечение студентов к исследовательской работе. Он должен всегда находить время для общения со студентами-кружковцами, детально обсуждать с ними все волнующие их вопросы.

Руководитель кружка должен тщательно готовиться к проведению заседаний, обязательно их разнообразить по изучаемым вопросам, целям, характеру выполнения и уровню проявления познавательной активности студентов. Положительный результат обычно дают нестандартные формы организации работы кружка. Здесь проявляется методическое мастерство преподавателя, его творчество и научный потенциал.

Таким образом, организация работы в студенческого научного общества предполагает тесное сотрудничество студента и преподавателя, наличие серьезной мотивации с обеих сторон, что будет способствовать активизации творческого потенциала студентов и содействовать правильному формированию интеллектуального потенциала будущих ученых, руководителей, организаторов, работников различных сфер производства.

ЛИТЕРАТУРА

1. Колесников, А.В. Организация и учебно-методическое обеспечение контроля самостоятельной работы / А.В. Колесников // Вышэйшая школа. – 2005. - № 5. – С.66-69.
2. Лобанов, А.П. Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Мн.: РИВШ, 2005. – 107 с.

УДК 378.663:147:811.161.3 (476.6)

## ЗМЕСТ І ЗНАЧЭННЕ ТЭМЫ “МОВА І СОЦЫУМ” У КУРСЕ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”

**Данільчык З.П.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навучальныя планы ВНУ Рэспублікі Беларусь прадугледжваюць вывучэнне курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”. Гэта дысцыпліна дапамагае студэнтам далучыцца да багаццяў нацыянальнай культуры, сфарміраваць камунікатыўна развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці справавую дакументацыю, выступаць з публічнымі прамовамі і г. д. Названы курс скіраваны на засваенне і прафесійнае прымяненне беларускай тэрміналогіі ў залежнасці ад галіны навукі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць любую інфармацыю на беларускай мове, а таксама дакладна і асэнсавана выказваць па-беларуску свае думкі, спрыяць павышэнню прэстыжу беларускай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Тыпавая вучэбная праграма гэтага курса прадугледжвае пачынаць заняткі з тэмы “Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых каштоўнасцей”, дзе размова павінна весціся пра мову як сацыяльную з’яву, пра функцыі мовы ў грамадстве, а таксама пра беларускую мову як форму нацыянальнай культуры беларусаў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Яшчэ са школы студэнты ведаюць, што слова “мова” мнагазначнае, але на пытанне, што ж такое мова ў прамым і асноўным значэнні, не заўсёды могуць адказаць. Таму выкладчыкам прапаноўваецца азначэнне, што мова – сукупнасць агульнапрынятых гукавых і лексіка-граматычных сродкаў для выказвання думак і наладжвання сувязі паміж людзьмі, якое студэнты павінны ўсвядоміць і ведаць на памяць. Засяроджваецца ўвага і на тым, што мова – асноўны, найважнейшы сродак зносін у параўнанні з іншымі сродкамі камунікацыі (жэстамі, мімікай, азбукай Морзе, выяўленчым мастацтвам, музыкай), якія, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі сродкамі інфармацыі.

На гэтых жа занятках студэнтам неабходна прапанаваць розныя гіпотэзы адносна паходжання мовы, даць адказ на пытанне, як яна ўзнікла, бо ў школьным курсе гэтае пытанне не разглядаецца зусім. Сярод гіпотэзаў наконт паходжання мовы можна вылучыць наступныя:

1) *гукаперaймальная*, калі чалавек пачаў пераймаць гукі навакольнага свету (шум ветру і вады, спеў птушак, крык звяроў і інш.), якія, магчыма, сталі асновай слоў-назваў чалавечай мовы;

2) *выклічнікавая*, згодна з якой штуршком для ўзнікнення мовы з’явіліся інстынктыўныя гукавыя комплексы тыпу ой-ой-ой, ха-ха-ха, э-хэ-хэ і іншыя як рэакцыя на пэўныя раздражняльнікі (боль, радасць, гнеў і г. д.);

3) *працоўная*, паводле якой мова ўзнікла як вынік сумеснай дзейнасці першабытных людзей, якія для ўзгаднення сваіх працоўных дзеянняў прамаўлялі пэўныя гукавыя комплексы, што ляглі ў аснову мовы;

4) *логасная* (ад грэч. *logos – слова*), сутнасць якой заключаецца ў тым, што ў аснове мовы ляжыць духоўны пачатак. Пра гэта напісана ў Бібліі.

Разглядаючы розныя тэорыі пра паходжанне мовы, неабходна зрабіць агаворку, што яны з’яўляюцца толькі гіпатэтычнымі (меркавальнымі, здагадкавымі), а само пытанне застаецца адкрытым і па сённяшні дзень.

Абавязковым элементам на занятках павінен быць тэзіс аб тым, што мова – з’ява сацыяльная, г. зн. звязана з грамадствам. Тут можна прывесці наступнае выказванне Л.І. Сямешкі, што “… мова – гэта неабходная ўмова існавання грамадства, яго падмурак. Без яе не можа быць грамадства, як і сама мова не можа існаваць без грамадства” [1, с. 5]. Немаўля, якое не чуе чалавечай мовы, пазбаўлена ўзаемаадносін з людзьмі, ніколі не навучыцца гаварыць. Без падтрымкі іншых людзей дзіця не рэалізуе сваёй здольнасці стаць чалавекам разумным. Мова не перадаецца ў спадчыну кожнаму канкрэтнаму чалавеку, таму што дзіця пачынае гаварыць менавіта на той мове, якую чуе з першых дзён жыцця (і гэта бывае не абавязкова мова продкаў). Мова, з аднаго боку, ёсць з’ява індывідуальная, бо ўласціва канкрэтнаму чалавеку; з другога ж боку, мова – з’ява сацыяльная, бо належыць канкрэтнай грамадскай супольнасці. А ў гэтым праяўляецца яе дваісты характар.

На ўступных занятках патрэбна засяродзіць увагу і на функцыях, якія выконвае мова ў жыцці чалавека і грамадства. Па-першае, асноўнай функцыяй з’яўляецца *камунікатыўная*, г. зн. што мова – асноўны сродак зносін паміж людзьмі. Карыстаючыся мовай, людзі разумеюць адзін аднаго, абменьваюцца інфармацыяй і г. д. Па-другое, важнай функцыяй мовы выступае і *кагнітыўная*, або *пазнавальная*, з дапамогай якой людзі назапашваюць веды, атрымліваюць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

адукацыю ў пэўнай галіне навукі, папаўняюць жыццёвы кругагляд. Па-трэцяе, з пазнавальнай мае сувязь *намінатыўная* функцыя, якая "звязвае" чалавека з навакольным светам, бо ўсё (прадметы, прыметы, з'явы, дзеянні, станы і г. д.), што нас акружае, мае назву з дапамогай слова. Па-чацвёртае, "паколькі словы з'яўляюцца сродкамі мастацкай творчасці, то мова валодае яшчэ і *эстэтычнай* функцыяй. Пры дапамозе слова можна ўздзейнічаць на пачуцці і думкі чалавека, рэгуляваць яго дзейнасць, выклікаць у яго шмат эмоцый, як станоўчых, так і адмоўных" [2, с. 14-15]. Па-пятае, пры дапамозе мовы назапашваюцца, захоўваюцца розныя традыцыі, звычаі народа. І ў гэтым праяўляецца *акумулятыўная* функцыя мовы, якая захоўвае спадчыну нацыі, звязвае продкаў з нашчадкамі. Прыкладам могуць быць фразеалагізмы, якія не ствараюцца кожны раз па-новаму, а перадаюцца з пакалення ў пакаленне, узнаўляюцца як гатовыя ўстойлівыя моўныя адзінкі. Пералічаныя функцыі мовы ў працэсе маўлення могуць узаемадзейнічаць, спалучацца і перакрыжоўвацца паміж сабой.

Падчас першых і наступных аўдыторных заняткаў выкладчык павінен прывіваць у студэнтаў любоў да роднага слова, напамінаць ім пра самую надзённую ісціну жыцця: калі жыве мова, то жыве і народ, а калі няма мовы – няма і народа. Не павінна заставацца па-за ўвагай студэнтаў і тая акалічнасць, што асноўным інструментам для авалодання роднай мовай з'яўляецца слова. Без матчынага слова народ губляе сваё аблічча. Пра гэта слушна зазначыў Б. Сачанка: "Прырода, якая б разнастайная і багатая ні была, не стварыла нічога лепшага, больш прыдатнага для творчасці, чым слова. У слове пластыка, у слове музыка, у слове фарбы, у слове тое, чаго нідзе і ні ў чым няма, – сэнс, адухоўленасць… У штодзённай мітусні і клопаце ніколі не трэба забываць пра слова, трэба дбаць пра яго, усяляк берагаць, шанаваць, развіваць, каб яно служыла яшчэ лепш, як служыла бацькам, дзядам, прадзедам". З гэтым выказваннем нельга не пагадзіцца.

Такім чынам, уступныя заняткі на тэму "Мова і соцыум" маюць важнае значэнне для засваення дысцыпліны "Беларуская мова (прафесійная лексіка)", з'яўляюцца тым падмуркам, на якім грунтуецца вывучэнне названага курса. Сам жа прадмет на неспецыяльных факультэтах ВНУ рэспублікі – рэч патрэбная і карысная, бо тут рыхтуюцца высокакваліфікаваныя кадры не толькі па абранай спецыяльнасці, але і асобы з вялікім інтэлектуальным узроўнем і шырокім кругаглядам.

ЛІТАРАТУРА

1. Сямешка, Л.І. Беларуская мова / Л.І. Сямешка. – Мінск: Сучаснае слова, 1999. – 223 с.
2. Гіруцкая, Л.А. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў БНТУ. У 4 ч. Ч. 1 / Л.А. Гіруцкая і інш.; пад рэд. Л.А. Гіруцкай. – Мінск: БНТУ, 2005. – 289 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГАТУ